КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ

# КНІГА АБ НАРОДНЫХ МСЦІЎЦАХ

Аб гераічнай барацьбе слаўных партызан апавядаецца ў кнізе былога камандзіра партызанскага злучэння, цяпер сакратара Віцебскага абкома КПБ В. Е. Лабанка «Партызаны Віцебшчыны ў баях за Радзіму», выпушчанай Дзяржаўным выдавецтвам БССР у 1959 годзе.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны па закліку роднай Камуністычнай партыі беларускі народ, як і ўсе народы нашай неабсяжнай краіны, узняўся на свяшчэнную вайну супраць ненавіснага ворага. Сотні тысяч савецкіх патрыётаў з першых дзён акупацыі тэрыторыі Беларусі ўходзілі ў лясы, здабывалі зброю, боепрыпасы і арганізоўваліся ў партызанскія атрады і дыверсійныя групы. У тылу ворага на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 198 партызанскіх брыгад, якія аб'ядноўвалі 1.053 партызанскія атрады. Велізарная армія народных мсціўцаў змагалася за свабоду і незалежнасць нашай сацыялістычнай Радзімы. Абапіраючыся на дапамогу беларускага народа, слаўныя партызаны вялі бязлітасную барацьбу з акупантамі, не даючы ім спакою ні днём, ні ноччу. Аўтар паказвае, што не было ў Беларусі такога кутка, дзе не ішла б усенародная жорсткая барацьба супраць іншаземных захопнікаў.

Вораг дарагой цаной заплаціў за акупацыю Віцебскай вобласці. Нямецка-фашысцкія захопнікі спрабавалі фарсіраваць Заходнюю Дзвіну на Полацкім напрамку. Нашы войскі контратакай адкінулі іх на паўднёвы бераг ракі. На подступах да ракі гітлераўцы пакінулі тысячы трупаў, многа падбітых танкаў і самалётаў.

Гарэла зямля пад нагамі гітлераўцаў. Савецкія людзі аб'ядноўвалі, цэментавалі свае сілы, каб даць адпор фашыстам, выгнаць іх з савецкай зямлі. Першы партызанскі атрад на Віцебшчыне быў створан 9 ліпеня 1941 года. Гэта быў атрад бацькі Міная.

Ад азёрнай Віцебшчыны да пінскіх балот, ад Белавежскай пушчы да Прыднепроўя—па ўсёй Беларусі гарэла нязгаснае полымя партызанскай вайны.

Асобныя групы і атрады партызан ператвараліся ў магутныя злучэнні, якія наносілі ворагу паражэнні там, дзе ён іх не чакаў. Па сіле і магутнасці нанесеных удараў, па масавасці і арганізаванасці партызанскі рух на тэрыторыі Віцебскай вобласці займае ганаровае месца ва ўсёй барацьбе беларускіх народных мсціўцаў.

Для кіраўніцтва падпольнымі партыйнымі арганізацыямі і партызанскімі атрадамі абкомам партыі былі пакінуты ў тылу праціўніка партыйна-савецкія работнікі, камуністы, актывісты. У Багушэўскім раёне гэты патрыятычны рух узначалілі сак-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ